году» [6, с. 127] и продолжая выстраивать антиномичную хрестоматийному Раскольникову позицию.

Наконец, теснота комнаты и скованность материального положения становятся заключительными маркерами рецепции. В изложении Панкина, Раскольников «курил дешевый беломор», а заржавленный топор хранил не иначе как «меж холодильником и стенкой» [6, с. 127]. Специалист в области мифопоэтики Е.М. Мелетинский в «Заметках о творчестве Достоевского» выделяет тему узости и ужаса, которая «воплощается в образе человека в углу между шкафом и дверью (стеной, окном)» [5, с. 224]. Помещая орудие убийства, источник угрозы, в соответствующий простенок комнаты Раскольникова, современный поэт аллегорически напоминает о скрытой мощи железа, остающейся скованной благодаря апатии Родиона Романовича.

Следовательно, гибридный Раскольников аккумулирует в себе следы прозы Пушкина, Гоголя, Достоевского. Сверхцитатность персонажа обеспечивается наслоением образов «маленького» и «лишнего» человека, в результате чего Панкин выводит прототип нового героя-бунтовщика, до времени отложившего в сторону свой топор.

Литература

1. *Быков Д.* Я чувствую Бродского обворованным // Огонек. 2008. № 44. Интернет-адрес: http://www.kommersant.ru/doc/2301648.
2. *Достоевский Ф. М.* Полное собрание сочинений: В 30 т. / АН СССР. Ин-т рус. лит. (Пушкин. дом). Л., 1972–1990. Т. 6: Преступление и наказание. 1973.
3. *Карасев Л. В.* О символах Достоевского // Вопросы философии. 1994. № 10. Интернет-адрес: http://www.durov.com/study/file-602.htm.
4. *Лосев Л.* Несколько новых стихотворений // Знамя. 2001. № 1. Интернет-адрес: http://magazines.russ.ru/znamia/2001/1/losev.html.
5. *Мелетинский Е. М.* Заметки о творчестве Достоевского. М., 2001.
6. *Панкин Б.* Новый Раскольников: стихотворения. Киев, 2011.
7. *Погорелая Е.* Диалоги с говорящим попугаем (о поэзии Льва Лосева) // Арион. 2010. № 4. Интернет-адрес: http://magazines.russ.ru/arion/2010/4/po19.html.
8. *Пушкин А. С.* Полное собрание сочинений: В 3 т. / М., 1954. Т. 3: Евгений Онегин. Сказки. Драматические произведения. Отрывки и наброски. 1954.
9. *Чайковская И.* Под знаком одиночества и свободы. Интервью со Львом Лосевым // Чайка. 2008. № 6 (113). Интернет-адрес: https://www.chayka.org/node/1798.

ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ З КАМПАНЕНТАМ-АРНІТОНІМАМ У БЕЛАРУСКАЙ І ІСПАНСКАЙ МОВАХ

В. В. Рэпетта Міхеенкава

Арнітаморфны код займае значнае месца ў традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў многіх краін. Арнітонімы набылі багатую сімволіку і сталі ўвасабленнем нацыянальна-культурных

асаблівасцей мыслення ў сувязі з прысутнасцю птушак амаль ва ўсіх сферах жыцця чалавека.

На думку М. В. Куцьевай, «і для сферы пераносных значэнняў лексікі, і для семантыкі фразеалагізмаў з кампанентам-арнітонімам характэрны ярка выражаны антрапацэнтрызм» [4, с. 12]. У беларускай і іспанскай лінгвакультурах пашыраны фразеалагічныя адзінкі з кампанентамі-арнітонімамі *курыца* і *певень*, што ўжываюцца для характарыстыкі чалавека: адлюстравання яго знешнасці, рысаў характару, разумовых здольнасцей, дзеянняў ці паводзін у грамадстве.

Арнітонім *курыца* ў беларускай мове часта выкарыстоўваецца ў складзе фразеалагічных адзінак у якасці сімвала прастакаватасці, глупства, легкадумнасці, нездагадлівасці. Такія якасці чалавека рэалізуюцца ў значэннях фразеалагізмаў *курыны розум*, *курыная галава* і інш. В. Г. Гаўрыловіч, аналізуючы фразеалагізм *курыная галава*, сцвярджае, што гэта «фразеалагічная адзінка мае адначасова метафарычную (інтэлект чалавека прыпадабняецца да інтэлекту курыцы як сімвала глупства, адсутнасці інтэлектуальных якасцей і памяці) і метанімічную (галава-розум) аснову» [2, с. 216].

У іспанамоўных народаў арнітонім *курыца* ў асноўным асацыіруецца з нясмелым, недалёкім чалавекам. Гэту думку ілюструе большасць фразеалагізмаў з вышэйназваным кампанентам: *no nacer con carne de gallina* (літ. ‘не нарадзіцца з мясам курыцы’) у значэнні ‘быць смелым чалавекам’ [3, с. 139], *le come gallina* (літ. ‘яго есць курыца’), які мае значэнне ‘хтосьці баіцца’ [3, с. 284], *hacer la gallina uno* (літ. ‘зрабіцца курыцай’) у значэнні ‘збаяцца, спужацца’ [3, с. 139], *cobarde como una gallina* (літ. ‘баязлівы як курыца’), што значыць ‘баязлівы’ [3, с. 139], *más tonto que las gallinas* (літ. ‘дурнейшы за курыцу’), які мае значэнне ‘неразумны’ [3, с. 139].

З прычыны таго, што курыца – архетып пладаноснага, жыццятворнага пачатку, ёй уласціва ярка выражаная жаночая сімволіка. Прыкладам агульнасці поглядаў беларусаў і іспанцаў з’яўляюцца фразеалагізмы *насіцца як курыца з яйкам* (*з яйцом*), які мае значэнне ‘незаслужана ўдзяляць шмат увагі каму-небудзь ці чаму-небудзь’ і ўжываецца для характарыстыкі чалавека [5, с. 625] і *como gallina con huevos* (літ. ‘як курыца з яйкамі’) у значэнні ‘дрыжаць, трэсціся над кім-небудзь’ [3, с. 285]. Беларускі фразеалагізм мае адмоўную канатацыю, што можна назіраць на наступным прыкладзе: *Эксперыментальны раён, на які Шугачоў разяўляў рот і з ідэяй якога* ***носіцца як курыца з яйкам****, патрабуе дадатковых асігнаванняў* (І. П. Шамякін [5, с. 625]). Для іспанскай фраземы, якая ўжываецца звычайна ў адносінах да празмерна клапатлівых маці, характэрна станоўчая канатацыя.

Сярод іспанскіх фразеалагізмаў варта адзначыць тыя, што перадаюць стан асобы ў пэўнай сітуацыі: *como gallina en corral* (літ. ‘як курыца ў загоне’) у значэнні ‘адчуваць сябе свабодна’ [3, с. 139]. Для названай вышэй фразеалагічнай адзінкі ў іспанскай мове існуе антанімічная фразема *como gallina en corral ajeno* (літ. ‘як курыца ў чужым загоне’) – ‘адчуваць сябе няўтульна’ [3, с. 139]. Фразеалагічнай адзінцы *como gallina en corral*, якая мае значэнне ‘як курыца ў загоне’, у беларускай мове адпавядае фразеалагізм *як рыба ў вадзе*, што ўжываецца ў значэнні ‘вельмі свабодна, натуральна і проста (адчуваць сябе)’ [5, с. 476].

У іспанскай фразеалогіі знайшло адлюстраванне супрацьпастаўленне *певень – курыца*, за якім стаіць парада сацыяльнага характару: не блытаць мужчынскую і жаночую ролі ў сям’і. Гэты тэзіс прасочваецца ў іспанскай лінгвакультуры, дзе жанчына лічыцца другаснай у адносінах да мужчыны, яго вядучай ролі ў сям’і, што можна заўважыць у іспанскіх прыказках: *Desgraciado el gallinero donde la gallina canta y el gallo cacaraquea* (літ. ‘Няшчасны той гаспадар, у якога курыца пяе, а певень квохча’); *Donde hay gallo, no canta gallina* (літ. ‘Дзе ёсць певень, курыца не пяе’) [3, с. 14]. У прыказцы *Hay veces que vale mas ser gallina que gall*o (літ. ‘Часам лепш быць курыцай, а не пеўнем’) [3, с. 16] звяртаецца ўвага на прынцыповасць, адвагу пеўня і памяркоўнасць, асцярожнасць курыцы. Прыказка раіць у асобных выпадках праяўляць асцярожнасць, уласцівую жанчыне, а не задзірыстасць, якая характэрна для мужчын.

У іспанскіх фразеалагізмах з кампанентам-арнітонімам *курыца* адлюстравана жаданне мужчыны мець паслухмяную жонку: *Gallina ponedora y mujer silenciosa, valen cualquier cosa* (літ. ‘Курыца-нясушка і маўклівая жонка дорага каштуюць’); *Gallina que al gallo espanta, córtale la garganta* (літ. ‘Курыцы, якая пужае пеўня, перарэж глотку’) [3, с. 14].

Значная частка іспанскіх фразем суадносіцца па значэнні са славянскімі прыказкамі, напрыклад: ісп. *matar uno la gallina de los huevos de oro* (літ. ‘забіць курыцу, якая нясе залатыя яйкі’) і бел. *пілаваць сук, на якім сядзіш* у значэнні ‘перашкодзіць самому сабе’; ісп. *Como las gallinas que escarba y se echa la tierra encima* (літ. ‘Куры, якія капалі яму, пахаваныя ў ёй апошнімі’) і бел. *Не капай другому яму, сам у яе ўвалішся* са значэннем ‘непрыемнасць можа здарыцца з тым, хто жадае ці робіць яе іншым’. Устойлівы выраз у скалькаваным выглядзе ўжываецца ў мовах многіх хрысціянскіх краін, што можна патлумачыць яго паходжаннем з біблейскага тэксту.

У старажытнай народнай свядомасці беларусаў певень – птушка дзённага святла, прадвеснік сонечнага ўсходу. Канцэпт *певень* рэпрэзентуе сонечны кругазварот. На думку А. Л. Садоўскай, «з пеўнем у архаічнай народнай свядомасці, і, адпаведна, у фальклорнай і

фразеалагічнай традыцыях звязаны шэраг станоўчых сімвалічных уяўленняў» [8, с. 131]. Такое ўяўленне беларусаў ляжыць у аснове этымалогіі фразем *да першых пеўняў* у значэнні ‘вельмі позна, да сярэдзіны ночы, да поўначы (сядзець, гуляць, не спаць і інш.)’, *да другіх пеўняў* са значэннем ‘незадоўга да світання’ і *да трэціх пеўняў*, які мае значэнне ‘да самага світання (быць дзе-небудзь, займацца чым-небудзь і інш.)’ [5, с. 298]. Значэнне ўсіх трох фразеалагізмаў добра ілюструе беларуская прыказка: *Першыя пеўні – поўнач, другія пеўні – пара ўставаць, трэція пеўні – пярэдсвет* [7, с. 31].

Адной з галоўных характарыстык пеўня з’яўляецца яго выключная ваяўнічасць, задзірыстасць, што знайшло адлюстраванне ў беларускіх устойлівых выразах *гарачы як певень, чубацца як пеўні* і інш. «У старажытнасці лічылася неабходным і пачэсным, – адзначае Л. М. Анісаў, – каб певень быў бойкі і задзірысты. Для гэтага ў Чысты чацвер яго кармілі перцам і выкідвалі з акна» [1, с. 307]. Бойкасць пеўня стала падставай для з’яўлення беларускай фразеалагічнай адзінкі з іранічным адценнем *смажаны певень (дзюбнуў) у зад (у азадак)*, якая мае значэнне ‘хто-небудзь сустрэўся з сапраўднымі жыццёвымі цяжкасцямі, зведаў нягоды ў жыцці’ [5, с. 277].

Ваяўнічасць, задзірыстасць пеўня з’яўляюцца галоўнымі характарыстыкамі, пакладзенымі ў аснову іспанскіх фразем з кампанентам-арнітонімам *певень*: *alzar el gallo* (літ. ‘падняць пеўня’) – ‘паводзіць сябе задзірыста’, *dar gallo* (літ. ‘даць пеўня’) – ‘сапернічаць з кім-небудзь’, *hacerse uno el gallo* (літ. ‘стаць пеўнем’) у значэнні ‘вяршэнствавацъ’ [3, с. 285].

У іспанскай фразеалогіі шмат увагі надаецца голасу пеўня. Напрыклад, *Este gallo que no canta, algo tiene en la garganta* (літ. ‘Гэты певень, які не пяе, нешта мае ў глотцы’) у значэнні ‘гэты чалавек нешта скрывае’, *Más claro que canta un gallo* (літ. ‘Больш зразумела, чым пяе певень’) у значэнні ‘дакладна’. Разам з тым звонкі, гучны спеў пеўня асацыіруецца з удачай: *Otro gallo me cantará* (літ. ‘Іншы певень мне спяе’) у значэнні ‘ўсё зменіцца да лепшага’ [3, с. 286].

У беларусаў спеў пеўня, як правіла, асацыіруецца з вёскай, яе немнагалюднасцю, традыцыйным жыццёвым укладам, які супрацьпастаўляецца гарадскому. «У Лацінскай Амерыцы, – падкрэслівае Л. В. Маісеенка, – наадварот: лічыцца, што калі дзесьці чуваць галасы пеўняў, значыць, там ёсць шмат людзей, а пра адасобленае месца кажуць, што “там нават пеўні не пяюць”» [6, с. 187].

Як адзначае М. В. Куцьева, «лексема *певень/gallo* уваходзіць у групу слоў іспанскай мовы, што выкарыстоўваюцца ў фамільярна-побытавым рэгістры камунікацыі ў фатычнай функцыі: – *¿Qué quieres, gallo?* (літ.

Чаго табе, певень?) (J. L. Vilallonga. Fiesta)» [4, с. 11]. Такая формула размовы не адпавядае нормам маўленчага этыкету беларусаў і можа выкарыстоўвацца толькі з мэтай пакрыўдзіць чалавека. У іспанскай мове слова *gallitos* (літ. ‘пеўнічкі’) у значэнні ‘забіякі’ ўжываецца ў якасці звароту да дзяцей.

Такім чынам, у беларускіх і іспанскіх фразеалагічных адзінках знайшло адлюстраванне светаўспрыманне асобы праз прызму метафары, што ўзнікла на аснове назіранняў за звычкамі і паводзінамі птушак, сталых асацыяцый, якія характэрны для беларусаў і іспанцаў. У беларускіх і іспанскіх фразеалагізмах вобраз курыцы рэпрэзентуецца як аб’ект для насмешак і пагарды. У аснову фразем з лексемай *певень* у беларусаў пакладзены наступныя ўяўленні: певень – сонечны кругазварот, прадвеснік раніцы, увасабленне ваяўнічасці і задзірыстасці, ганарлівасці і непакорлівасці. У іспанскай мове фразеалагізуюцца такія якасці пеўня, як ваяўнічасць, бойкасць. Вобраз пеўня асацыіруецца з рэвалюцыянерам, чалавекам нязломнага духу, што звязана, у першую чаргу, з традыцыяй пеўневых баёў. Шмат увагі ў іспанскай фразеалогіі надаецца голасу пеўня, які сімвалізуе ўдачу.

Літаратура

1. *Анисов Л. М.* Славянская мифология. М., 1995.
2. *Гаўрыловіч В. Г.* Метафарызацыя найменняў птушак у фразеалагізмах беларускай і англійскай моў // Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння (да 95-годдзя з дня нараджэння прафесара Ф. М. Янкоўскага): Зб. навук. арт. Мн., 2013. С. 215–217.
3. Испанско-русский фразеологический словарь / Э. И. Левинтова, Е. М. Вольф, Н. А. Мовшович, І. А. Будницкая. М., 1985.
4. *Кутьева М. В.* Национально-культурная специфика переносных значений орнитонимов в русском и испанском языках. М., 2009.
5. *Лепешаў І. Я.* Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2 т. Мн., 1993.
6. *Моисеенко Л. В.* Параметры концепта как основание систематизации лингвокультурологических знаний. М., 2007.
7. Прыказкі і прымаўкі: У 2 кн. / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1976.
8. *Садоўская А. Л.* Фразеалагізмы з кампанентам-арнітонімам у беларускай мове: этналінгвістычны аспект. Мн., 2011.

СТРУКТУРНО-МОРФОЛОГИЧЕСКИЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ ТЕРМИНОВ УГОЛОВНОГО ПРАВА В НЕМЕЦКОМ, РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

А. И. Федоринчик

Одной из важнейших задач современного языкознания является проблема изучения терминологии. Существует множество работ, в которых